Для дзетак 3-6 год

Глядзіце на YouTube




Videostudio "Raju"

# Прыгоды Козачкі Зефіркі

## Сшытак з забаўкамі №1



Збяры сваю мапу прыгод!

Серыя 1 Знаёмства

**Шаноўныя дзеці і бацькі, выхавацелі і настаўнікі!**

Вас вітае відэастудыя “РАЮ”! Мы аб’ядналіся, каб ствараць адукацыйна-пазнавальны кантэнт для дзяцей на беларускай мове.

Сшытак, які вы бачыце, з’яўляецца вынікам супольнай працы выкладчыкаў і метадыстаў, дзеячоў тэатра і кіно і мастакоў, бацькоў і дзяцей. Па QR-коду злева вы зможаце паглядзець першую серыю з цыклу “Прыгоды Казачкі Зефіркі”.

Разам з Зефіркай мы запрашаем вас гуляць і выдумляць, лічыць і маляваць, назіраць і расфарбоўваць, а таксама вывучаць навакольны свет і сябе ў ім.



**Змест і прыклады заданняў:**

**Старонкі 3-4 ................................“Хатні тэатрык”**
Выражце персанажыкаў, прыклейце на шпажкі і разыграйце сцэнку знаёмства. Прыклады таго, што могуць сказаць персанажыкі, вы знойдзеце на старонцы 4.

**Старонкі 5-7 ...................................“Шпацыр па лесе”**
Перад вамі карткі з ляснымі кветкамі Беларусі і іх назвы:

| | |
|---|---|
| 1 - званочкі | 6 - шыпшына |
| 2 - пралескі | 7 - багаткі |
| 3 - кісліца | 8 - Венерын чаравічак |
| 4 - зверабой | 9 - дзьмухавец |
| 5 - майнік | 10 - ключыкі |

Выражце кветкі і іх назвы. Каб запомніць іх, прапануем некалькі гульняў:

- Спачатку проста паказваць і называць.
- Паказаць картку з кветкай і назваць яе; партнёр кажа “праўда ці не”.
- Выкласці на стале кветкі і назвы, знайсці пары.
- Раскласці кветкі на стале, адзін гулец заплюшчвае вочы, другі прыбірае адну картку, першы называе кветку, якой не хапае (можна не прыбіраць кветку, а, напрыклад, мяняць кветкі месцамі, каб партнёр казаў, што змянілася).
- Пакласці малюнак з кветкай у пакоі (картка абавязкова мусіць быць бачная), каб гульцы шукалі (важна: гульцы не маюць права выкарыстоўваць рукі, шукаюць толькі вочкамі)
- Выкласці ланцужком кветкі, запомніць паслядоўнасць і назваць не гледзячы.
- Узяць карткі з сабой на шпацыр і пашукаць жывыя кветкі.

Калі раздрукаваць гэтыя старонкі 2 разы, то можна пагуляць вось так:
- Выкласці карткі малюнкам уніз і знайсці ўсе пары (“мэмары”).
- Разрэзаць адзін камплект картак на 2 ці больш кавалкаў, перамяшаць і скласці.
- Раскласці карткі з назвамі тэкстам уніз, раздаць кожнаму гульцу па камплекту кветачак; пераварочваем назву, чытаем, кладзем са свайго камплекта кветку малюнкам уніз; на 1-2-3 паказваем кветку.
- Гульцы загадваюць карткі і на 1-2-3 паказваюць; калі супадзе, то выдатна.

**Старонкі 8-9 ..................“Прыглядаемся і заўважаем”**
Прапануем прыгледзецца да кветачкі і вывучыць, як называюцца яе часткі: карэньчыкі, лісце, сцябло, чашалісцік, бутон, тычынкі, песцік, пялёсткі. Вазьміце кальку і паспабуйце намаляваць кветку самі (для гэтага можна выкарыстаць і аркуш звычайнай паперы, падысці да вакна і намаляваць абрыс, прыклаўшы малюнак да шыбы). Для таго, каб вывучыць, з чаго складаецца кветка, можаце выразаць карткі са старонкі 9 і скарыстацца ідэямі гульняў з назвамі кветак. Таксама падчас шпацыру, можна назіраць за кветачкамі і адказваць на пытанні: колькі пялёсткаў? як выглядае лісток? ці доўгае сцябло? і інш.

**Старонкі 10-11....................................“Мапа прыгод”**
Гэтыя старонкі прысвечаныя Лесу, дзе адбываюцца прыгоды Казачкі Зефіркі. Збіраючы кавалкі мапы ад серыі да серыі, вы зможаце скласці сваю гульню-хадзілку. На старонцы 10 вы знойдзеце заданні і матэрыялы, каб мапа выглядала цікавей, а старонка 11 і ёсць сама мапа (дакладней, 1 з 9 яе кавалкаў).





**Далучайцеся да Прыгод Казачкі Зефіркі!**


Аўтар ідэі: **Юлія Букштановіч**
Метадыст-кансультант: **Ася Смаляк**
Мастак-дызайнер: **Кацярына Уласюк**
Каманда праекта: **Аксана Новік, Улад Пісараў, Рынцук Выстаробскі, Аляксей Юрашэвіч і нашыя шматлікія неабыякавыя сябры.**



Слімачок



Козачка Зефірка



Барсучок Дзёма



Пчолка Зося

Табе спатрэбяцца:
- нажніцы
- клей
- шпажкі

Каб гуляць:
- выражы персанажыкаў
- прыклей на шпажкі
- пазнаём персанажыкаў













Каб пазнаёміцца, табе дапамогуць наступныя словы:

- Вітаю!
- Добры дзень!
- Як цябе завуць?
- Мяне завуць ... А як тваё імя?
- Мяне клічуць ...
- Прыемна пазнаёміцца!
- І мне!
- Давай гуляць разам?
- Давай!



Званочкі



Шыпшына



Пралескі



Багаткіі



Кісліца



Венерын чаравічак



Зверабой



Дзьмухавец



Майнік



Ключыкі





1



2



3



4



5



6



7



8



9



10

| | |
|---|---|
| Кісліца | Дзьмухавец |
| Шыпшына | Зверабой |
| Пралескі | Майнік |
| Венерын чаравічак | Званочкі |
| Ключыкі | Багаткі |




| | | |
|---|---|---|
| Карэньчыкі | Тычынкі | Бутон |
| Лісце | Песцік | Чашалісцік |
| Пялёсткі | Сцябло | |

















# Старонка для мамы

## Выражы кветкі і знайдзі ім месца на кветкавай паляне (глядзі мапу прыгод).



# Мапа прыгод. Частка 1

Гэта 1на з 9ці частак мапы. Абавязкова захавай гэты аркуш для будучых прыгод. Прыклей кветкі на паляну і дапамажы Зосі знайсці шлях да вулея.



Паназіраць за здымачнай
кухняй студыі “РАЮ” можна тут:

VIDEO_STUDIO_RAJU